Грамадска-палітычная і інфармацыйна-рэкламная газета Стаўбцоўскага раёна

Прамень

Выдаецца з 22 верасня 1939 года

Нумары

№1

№95

№94

Далей

Калонка рэдактара

Задаць пытанне рэдактару

Навіна дня

Па традыцыі, напрыканцы 2013 года ў калектыве энергетыкаў былі падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю дзейнасці па ахове працы сярод падраздзяленняў. Сярод пяці РЭСаў, якія ўваходзяць у склад прадпрыемства, першае месца прысуджана Клецкаму РЭС, сярод вытворчых службаў лепшым прызнаны калектыў службы ліній электраперадач, сярод дапаможных службаў – калектыў службы механізацыі і транспарту. Электраманцёр службы ліній Уладзімір Новік названы лепшым грамадскім інспектарам філіяла РУП “Мінскэнерга” Стаўбцоўскія электрычныя сеткі.

Рэсурсы

Официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь

Номер №155

Нумар №155 ад 10.10.2012

Кароткім радком

Фото

У НАШАЙ КРАІНЕ. У ВОБЛАСЦІ

Прысвечана Дню маці



12 кастрычніка 2012 года ў раённым Цэнтры культуры адбудзецца ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню маці, – "Пакуль ёсць маці – на зямлі пануюць мір і шчасце". Пачатак мерапрыемства ў 15.00. Усіх маці сардэчна запрашаем на свята.

Няма ў свеце звання больш цудоўнага

Такую назву далі абласному святу, прысвечанаму Дню настаўніка, якое адбылося ў спартыўна-забаўляльным цэнтры горада Маладзечна. Стаўбцоўшчыну на гэтым святе прадстаўлялі педагогі і кіраўнікі ўстаноў адукацыі, прадстаўнікі аддзела адукацыі. Людзі, якія выбралі справай свайго жыцця настаўніцкую, пачулі шмат цёплых і прыемных слоў у свой адрас. Гэта стане стымулам для далейшай нялёгкай работы настаўніка, будні якога напоўны напружаннем і адказнасцю.

Ураджай-2012

Фото

ЦУКРОВАЯ ВОСЕНЬ. РАБОТ ВОСЕМ

Поле плошчай дзесяць гектараў

Минский областной исполнительный комитет

Столбцовский районный исполнительный комитет

Каталог интернет-ресурсов государственных органов

Радиостанция "Минская волна"

На Хатаўскім спіртовым заводзе не адмаўляюцца ад добрых традыцый, што служаць сацыяльнай абароне членаў калектыву.

Слава "Панскага маёнтка"

Адраджэнне былога сядзібна-паркавага комплексу пачатку XIX ст. у вёсцы Сула прызнана лепшым у рэспубліканскім конкурсе аб'ектаў, дзе рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы былі завершаны ў 2011 годзе.

Жыццёвыя пытанні



У райвыканкаме адбыўся прыём грамадзян з першым намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці Святланай Іванаўнай Сакалоўскай.

Салдат не вярнуўся з вайны



Мудра сказана: вайна заканчваецца толькі тады, калі пахаваны яе апошні салдат. Аднак колькі яшчэ на нашай беларускай зямлі невядомых магіл, пахаванняў тых, хто загінуў у Вялікую Айчынную. І ніхто не дасць адказу, як доўга будзе жыць з намі святы абавязак па аднаўленні імя апошняга, хто загінуў на той вайне.

Універсальнасць паслуг

Дэвіз сёлетняга паслання Генеральнага дырэктара Сусветнага паштовага саюза – “Новая стратэгія для новага свету”. Паколькі паштовыя паслугі з’яўляюцца рычагамі эканамічнага росту, то пошта няспынна працягвае ўкараненне навінак, распрацоўку эфектыўных і даступных паштовых паслуг, прыняцце агульных стандартаў, а таксама новых тэхналогій, каб разнастаіць і палепшыць асартымент прапанаваных паслуг.

Энергетыкі заўсёды на вышыні



Каманда Стаўбцоўскіх электрычных сетак, якую вы бачыце на здымку, прадстаўляла энергетыку Беларусі на IX Міжнародных спаборніцтвах прафесійнага майстэрства сярод краін СНД, адкуль вярнулася з ганаровым другім месцам.

Навіны Стаўбцоўшчыны

Фото
ПЕНА, ЯКОЙ НЯМА АНАЛАГАЎ. КАНВЕЕР НЕ ПАДВЯДЗЕ. ДЛЯ ЯБЛЫЧНЫХ ДАЛІКАТЭСАЎ. ВУЛІЦА ЗА ВУЛІЦАЙ. РАЗАБРАЦЦА З ЛІХТАРАМІ.

Калі мы будзем дбайнымі нашчадкамі?

Стаўбцоўшчына рыхтуецца да святкавання 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа і сустрэчы на сваёй зямлі шматлікіх гасцей.

Як выглядае дрэваапрацоўка

У пагоні за прыбыткам далёка не ўсе дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы раёна лічаць патрэбным удзяляць належную ўвагу пытанням навядзення парадку. Прылеглыя ўчасткі, ды і тэрыторыя самой фірмы нярэдка захламлены адходамі, металаломам, зарастаюць бур’яном. Каб не дапусціць гэтага, раённым выканаўчым камітэтам зацверджаны план мерапрыемстваў па паляпшэнні санітарна-тэхнічнага стану дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Не так даўно прайшоў і семінар-вучоба з работнікамі гэтай галіны, дзе даводзіліся асноўныя патрабаванні як з боку кіраўніка нашай дзяржавы, так і мясцовых уладаў. У верасні спецыялістамі санітарнай службы раёна зроблены аб’езд усіх 24-х аб’ектаў дрэваапрацоўкі, у тым ліку недзяржаўнай формы ўласнасці. Якія вынікі дзяржаўнага санітарнага нагляду? Пра гэта расказаў урач-гігіеніст раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Аляксандр БУЙНІЦКІ.

Не адмаўляйце ў дапамозе

Напярэдадні ацяпляльнага сезона раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях звяртаецца да ўсіх з просьбай – патурбавацца аб бяспечным стане дамоў нямоглых састарэлых людзей, інвалідаў, якія пражываюць адны.

Помнік ці прывід?



Нічога вечнага, кажуць, няма. Хоць часам здаецца, што штосьці праіснуе бясконца. Так і гэтая будыніна ўзводзілася вясковымі майстрамі з надзеяй на стагоддзі, што ні вятры, ні віхуры не зрушаць сцены – смалістыя, шкіпінарна-водарныя, з адборных спелых сосен, ні той нябачны чарвячок – шашаль – не згрызе іх. Што будзе тут заўсёды шумна, гаманліва ад людзей, павозак, вэрхалу напоўненых збажыной мяхоў. Нейкага паўстагоддзя назад так у Пагарэлаўскім млыне і было. Вада спраўна круціла жорны, пераціраючы струмені залатых зярнят, мучным пылком насыпаючы мяхі. Млын, нібы волат-каравай, напаўняў наваколле пахам духмяняга хлеба.

Той самы камень



У творах, успамінах Коласа знаходзім згадкі пра Чортаў камень, што ляжыць пры шляху на Сверынава. І калі хто лясной дарогай шыбаваў пешшу ці праязджаў на возе паўз гэтую каменнаю глыбу, то з ім здараліся незвычайныя прыгоды. Нібыта сам нячысцік жартаваў над хрысціянскай душой.

Ён і ў летапісе "Праменя"

6 кастрычніка споўнілася 104 гады з дня нараджэння Алеся Мілюця, беларускага пісьменніка.

Захапіцца цудамі Нясвіжа

Сёлета шматлікія працоўныя і школьныя калектывы раёна выказалі жаданне пазнаёміцца з адметнымі гістарычнымі і культурнымі мясцінамі роднай Беларусі і яе суседзяў.

Калі "страляюць" жартамі

Каманда вясёлых і знаходлівых Стаўбцоўскіх электрычных сетак “Кароткае замыканне” парадавала чарговым паспяховым выступленнем у паўфінале Гродзенскай лігі КВЗ. У гульні з камандамі з Гродна, Мінска і Пінска каманда стаўбчан заняла першае месца. Без жартаў!

г. Стоўбцы, вул. Сацыялістычная, 17.
тэл./факс.: 8-(1717)-55894
Адрас электронай пошты:
pramen@mail.belpak.by
info@pramen-news.by

© Прамень, 2014